Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 111 (28221) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Усё пра новыя грошы**

СТАР. 8

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Час збліжаць харчовыя рынкі**



**Падпісчык з 60-гадовым стажам**

СТАР. 17

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«Ва ўсіх склалася меркаванне, што КДК — самы строгі орган, які займаецца кантрольнай дзейнасцю ў Беларусі. Але на нас замыкаецца ўсяго 3-5% усіх праверак, якія праводзяцца ў краіне, ці нават менш. Асноўная іх маса ажыццяўляецца кантрольнымі і наглядными органамі, якія ўваходзяць у склад іншых ведамстваў і дзяржаўных органаў. У краіне ўдалося прадухіліць развіццё карупцыі. Мы не далі карупцыі глыбока ўкараніцца ў грамадстве, у зародку перарываючы гэтую з'яву. І самае галоўнае — мы выхавалі ў людзях пачуццё няўхільнасці пакарання».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19932,00 | ▲ |
| Еўра | 22460,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 304,62 | ▼ |
| Укр. грыўня | 798,40 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Здаёмся!

# ГРАДУС НАПРУЖАННЯ РАСЦЕ

## На «разумныя» гадзіннікі лепш не спадзявацца...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Раніцай у панядзелак побач са сталічнымі ВНУ было незвычайна шматлюдна. У 9.45 на ўваходзе ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт расцягнулася чарга на сотню метраў. На тварах прахожых, далёкіх ад хваляванняў прыёмнай кампаніі, чыталася неўразуменне: з якой прычыны? А ўсё вельмі проста — 13 чэрвеня ў краіне стартавала цэнтралізаванае тэсціраванне...**

### Фэйс-кантроль — абавязковы

Беларускую мову (а менавіта з тэста па беларускай мове і распачаўся двухтыднёвы экзаменацыйны марафон) сёлета пажадалі здаваць 22 348 чалавек. Для параўнання: на рускую мову зарэгістраваліся 78 (!) тысяч чалавек. Як бачна, прапорцыя зусім не на карысць роднай мовы.

У БДПУ імя Максіма Танка для здачы ў ЦТ па беларускай мове было выдзелена 1078 пасадачных месцаў у 13 аўдыторыях. На ўваходзе ўсе абітурыенты праходзяць строгі фэйс-кантроль: арганізатары супастаўляюць фота ў дакументах, так бы мовіць, з «арыгіналам». «Шукаем свае прозвішчы ў спісах. Яны размешчаны ў алфавітным парадку злева направа. Праходзім у гардэроб і здаём усе свае рэчы», — арыентуюць абітурыентаў, якія ўжо трапілі ў вучэбны корпус, валанцёры. Каму патрабуецца, дапамагаюць знайсці экзаменацыйную аўдыторыю... Усе арганізацыйныя моманты добра прадуманы, таму чарга на ўваходзе хутка растварыецца. У 10.30 большасць абітурыентаў ужо занялі свае месцы ў аўдыторыях.

Каб асабіста пераканацца ў тым, што ўсё арганізавана належным чынам, у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт завітала старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА.**

— Мяне цікавіць, якая інфармацыя даводзіцца да ведама абітурыентаў, наколькі камфортныя аўдыторыі выдзелены для экзамену, — расказала Наталля Качанава журналістам. — Асноўная функцыя дзяржкамісіі заключаецца ў стварэнні роўных умоў для ўсіх абітурыентаў, таму мы будзем сачыць за тым, каб экзамены паўсюдна прайшлі спакойна, арганізавана і ў добразычлівай абстаноўцы.

Па словах Наталлі Качанавай, створаная сістэма, якая шліфавалася гадамі, дазваляе ўсім сёння працаваць сумленна і адкрыта. «Мне здаецца, ні ў каго нават не ўзнікае думак наконт таго, што можна парушыць заканадаўства ў гэтым плане, — дадала яна. — Кожны кіраўнік навучальнай установы, дзе праходзіць ЦТ, разумее меру сваёй адказнасці. Паўсюдна выконваецца прапускны рэжым. Але ў кожнага члена дзяржкамісіі ёсць пасведчанне, пасля прад'яўлення якога ён мае права зайсці ў навучальную ўстанову».

Перад правядзеннем ЦТ Наталля Качанава яшчэ раз папярэдзіла абітурыентаў аб тым, што праносіць мабільныя тэлефоны і выкарыстоўваць падчас іспытаў розныя тэхнічныя прыстасаванні катэгарычна забараняецца. Каб ніхто потым не крыўдзіўся, калі іх выдаляць з аўдыторыі за парушэнне ўстаноўленых правілаў...

СТАР. 5

■ Надвор'е

# ДА НАС ІДЗЕ СПЯКОТА

## Сіноптыкі прагназуюць, што ў пятніцу на поўдні прыпячэ да плюс 33 градусаў

**Пасля некалькіх халодных дзён на тэрыторыю нашай краіны зноў вяртаецца сапраўднае лета, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**



А ўсё таму, што ў краіну рухаюцца вельмі цёплыя паветраныя масы з паўднёвых мораў, якія будуць суправаджацца навальніцамі, лівямі і парывістым ветрам. Праўда, у аўторак будзе яшчэ пераважна без ападкаў.

СТАР. 2

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

Падпісацца на газету можна самымі празнымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!